# 4. ЯЗЫК И ЛИТЕРАТУРА

## МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АПАВЯДАННЯЎ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

**Антановіч М.А.**
*УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”*

***Анатацыя***. У артыкуле разглядаюцца некалькі апавяданняў Яўгеніі Янішчыц, выяўляюцца іх мастацкія асаблівасці, праблемна-тэматычнае поле.

***Ключавыя словы***: апавяданне, празаічныя творы, лірычная гераіня, мастацкія асаблівасці.

Знакамітая паэтка Яўгенія Янішчыц пісала не толькі вершы, паэмы, але і прозу. У 2000 годзе некаторыя празаічныя творы пісьменніцы былі апублікаваны ў кнізе “Выбранае”, укладзенай А. Канапелькай і В. Коўтун. Уся празаічная спадчына пісьменніцы (21 твор; 5 апублікавана ўпершыню) сабрана ў 2-м томе 4-хтомнага выдання “Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі” (2017), укладальнікамі якога сталі С. Калядка і Т. Аўсяннікава.

У межах дадзенага артыкула разгледзім некаторыя празаічныя творы, якія даюць уяўленне аб іх мастацкіх асаблівасцях і майстэрстве Яўгеніі Янішчыц-празаіка. Пры знаёмстве з творамі звяртае на сябе ўвагу тое, што агульным пафасам апавяданні пісьменніцы сугучныя з яе вершаванымі і ліра-эпічнымі творамі пра  народнае жыццё.

Так, у апавяданні “Кошык бульбы” ўзнаўляюцца часы, калі чыталіся ў школе вершы пра “любімага правадыра Сталіна” і рабілі гэта дзеці, у якіх маці садзілі ў турму за кошык бульбы, прынесены з калгаса. Для дзяцей

таго часу недасяжным прысмакам быў яблык. Адзінаццацігадовая дзяўчынка "*журыцца, як дарослая, у думках (Якія яшчэ яблыкі, тут хоць бы бульбачкі да вясны хапіла. Але малой жа не скажаш пра гэта, гэтага Мілюня не зразумее)*" [1, с. 202]. Дзіцячая думка падсвечвае супярэчлівасць тагачаснага жыцця, калі простыя людзі не ведалі, як дажыць да новага ўраджаю, чым карміць дзяцей, а з радыёпрыёмніка даносілася: "*Не спи, вставай, кудрявая! / В цехах, звеня, / Страна встаёт со славою / На встречу дня*" [1, с. 202]. Глыбока псіхалагічна Яўгенія Янішчыц паказвае ранняе пасталенне вясковых дзяцей пасляваеннага часу, а таксама дапамогу вясковай жанчыны бацьку трох дзяцей, якія засталіся без маці.

У аснову твора "Антаніна? Не-э, Антон Сцяпанавіч" пакладзены аповед пра пакручасты лёс вясковай ўдавы, якую, паграджаючы смерцю, дамогся фашыст і ад яго нарадзіла яна дзіця. За знешні выгляд, мужчынскую цягавітасць у вёсцы яе насмешліва завуць мужчынскім імем. "*Адно што ў спадніцы, якая гаворыць аб прыналежнасці да жаноцкага роду. А так – кашуля на ёй мужчынская, валасы падстрыжаны надта каратка, рэзкія глыбокія маршчыны на ілбе таксама, як у мужчыны*" [1, с. 196]. Антаніна звыклася, што яе ніхто за бабу не прымае.

Аповед у творы вядзецца ад імя лірычнай гераіні- "пісацельніцы", якая прыехала ў вёску на пабыўку. Яна па просьбе кабеты і піша пісьмо народжанаму ад немца "гарушчаму сыну", якога, "*як ні крыўдна, як ні горка было, гадавала. Не абдзяляла ні ў чым яго, як і астатніх дзетак, хоць сэрца агнём пякло-смылела, кроўю аблівалася*", а ён забыўся на маці. Жаноцкасць Антаніны, тонкасць яе душы выяўляецца ў размове з партрэтам любага мужа, аднак не жадае кабета, каб нехта даведаўся, што яна баба "*хліпкая*".

Праблемы кахання, сям'і, міжасабовых адносінаў асэнсоўваюцца Яўгеніяй Янішчыц у апавяданні "Адно толькі ліха, што вароны каркаюць".

Твор пабудаваны ў форме дыялогу дзвюх суседак – вясковай кабеты Грыпіны і прыезджай на лета з горада маладзейшай жанчыны, якая ўспрымае сваю субяседніцу цётачкай. Кабета са спачуваннем адносіцца да няўдалага замужжа суседкі, раіць не жыць мінулым. Умудроная жыццёвым вопытам цётка даводзіць, што "*іншы раз трэба асмеліцца і – як у раку халодную кінуцца ды плыць, ано ж, пераплывеш, дасць Бог, пераплывеш*" [1, с. 193].

Імкнучыся падтрымаць маладую субяседніцу, Грыпіна распавядае пра сваё няшчаснае каханне, замужжа. Яе любы з'ехаў з бацькамі ў Казахстан, а маці не пусціла паехаць за каханым. Таму давялося 23-гадовай Грыпіне, якая, па вясковых мерках, ужо засядзелася ў дзеўках, пайсці замуж за аднавокага, глухаватага, скалечанага пасляваеннай мінай хлопца. Праз гады цётка не помніла, "*як там злюбілася*", але была ўпэўнена, што "*зжылося. Трое дзетак займелі*" [1, с. 192]. І хоць мужык яе "*не дужа ласкавы <...> хоць бы на слоўка якое!*", але не даваў у крыўду, узвышаў перад людзьмі.

Яўгенія Янішчыц паказала надзвычай адказныя адносіны да шлюбу і сям'і вяскоўцаў старэйшага пакалення, калі, нават не кахаючы адзін аднаго, людзі звівалі сваё гняздо, гадавалі дзетак, цешыліся іх поспехамі. Хоць і ў старэчым узросце Грыпіне сніўся яе каханы.

Такому адказнаму стаўленню да жыцця сямідзесяцігадовая жанчына супрацьпастаўляе маладых, у якіх ўсё па-іншаму: некаторыя "*аж па тры разы долі пытаюць*" [1, с. 193]. У вусны гераіні пісьменніца ўкладвае развaжанне і пра маладых, што пакідаюць вёску і з'язджаюць у горад у пошуках лепшага: "*вёска-то наша з кожным летам пусцее. Чым далей – тым больш. Хоць у касіры, хоць у судамойкі – абы з дзярэўні!*" [1, с. 192]. Замест людзей вёску апанавалі вароны і дакучаюць тым, хто ў ёй застаўся: "*Гэта ж трэба, каб сярод жывое яшчэ вёскі ды вараннё развялося –*

*расселася! Як над памерлымі якімі каркае, ці што…*” [1, с. 192]. Так Яўгенія Янішчыц закранула праблему неперспектыўных вёсак.

У невялікім апавяданні “Бомбачка” аўтарка расказвае пра мянушкі людзей у вёсцы, і за кожнай з іх “*і горкая і смешная гісторыя, ад якой, як кажуць, ці сляза скоціцца, ці бакі ад рогату надарвеш*” [1, с. 182]. Апавядальніца даведваецца ад самой уладальніцы мянушкі “Бомбачка” пра ўкладзены ў яе сэнс. Так празвалі грудастую цётку Вольгу. *“А ты паглядзі, паглядзі пільна на мяне. Няўжо не бачна? – і, рагочучы, каторы раз ужо зашпільвае-перашпільвае на грудзях тры слізкаватыя гузікі шаўковай, у яркія кветачкі кофты. – Хіба тут многа трэба казаць?”* [1, с. 198]. У свае шаснаццаць год Вольга была вельмі завіднай нявестай, адбою ад хлопцаў не было. Яе, *“як маліну тую, замуж схапілі”* [1, с. 198]. Цётка тлумачыць прычыну такой сваёй папулярнасці: “*Якая ж гэта дзеўка на той час была ды без грудзей? Яна ж і выгадаваць дзяцей, як след, не зможа. Гэта не тое, што цяпер: сосачкі-смосачкі ды ўсякія іскусцвянныя смесі – Алесі. Тады важна было, каб грудзі былі*” [1, с. 198]. Сямёра дзяцей выгадавала цётка, ганарылася, што чацвёра з іх “*да двух гадоў грудзей прасілі. Здаровенькія, крэпенькія ўсе параслі. Зубы, як часнок той, ва ўсіх беленькія, хрумсткія*”. Яшчэ большы гонар кабеты за дачок, якія ўсе па ёй пайшлі, “*грудастыя, пастаўныя «бомбачкі», ды і годзе! <…> Цяпер, дзякуй Богу, дзевятнаццаць унукаў маю. Шустрыя, крэпенькія <…> Вось, каб на такіх «бомбачках» ды свет увесь трымаўся, то і галава б не балела, і бяды б ніякае не было”* [1, с. 198]. Так пісьменніца актуалізавала сучаснікам адвечныя народныя каштоўнасці.

Героямі апавядання “Сардэчнасць”, у параўнанні з вышэй згаданымі творамі, з’яўляюцца гараджане. Твор пра міжасабовыя стасункі свекрыві і нявесткі, а канфлікт вынесены ў маральна-духоўную плоскасць. Лінда не любіць сваю нявестку і ўсяляк імкнецца абразіць яе. Яна не можа

змірыцца, што яе сын выбраў няўдаліцу Святлану, калі на статнага і віднага прыгажуна прэтэндавалі многія дзяўчаты. “*Святлане на трэцім годзе замуства ўжо немагчыма слухаць пра гэтых Алінак, Валек, Элачак!... Але душа ў яе мяккая, няпамятлівая*” [1, с. 200].

Твор заканчваецца тым, што Лінда Рыгораўна знаёміцца ў трамваі “*з маладой, але вельмі пацёртай жанчынай*”, вельмі спачувае яе лёсу, шкадуе “*гэтую «гарушчую душу»”*, запрашае да сябе ў госці, гатова суцяшаць і тлумачыць нявестцы гэта тым, што “*ласка такім патрэбна, цішыня, сардэчнасць. Ой, як патрэбна сардэчнасць!*” [1, с. 200].

Разгледжаныя апавяданні сведчаць, што Яўгенія Янішчыц арыгінальна рэалізавалася не толькі ў паэзіі, але і ў прозе. Стылёвымі асаблівасцямі яе празаічных твораў з’яўляюцца непасрэднасць, шчырасць, даверлівасць аповеду, народны гумар, гутарковыя інтанацыі. У аснове апавяданняў Яўгеніі Янішчыц непрыдуманыя жыццёвыя гісторыі, рэальныя людзі, любыя сэрцу пісьменніцы вяскоўцы. Асаблівую ўвагу аўтаркі прыцягваюць пакручастыя жаночыя лёсы, вобразы трывушчых вясковых кабет. Ёю выяўлены лепшыя рысы нацыянальнага характару, актуалізаваны народныя каштоўнасці і народная мудрасць. Так Яўгенія Янішчыц супрацьстаяла бездухоўнасці сучаснікаў.

**Список литературы**

1. Яўгенія Янішчыц : творы, жыццяпіс, каментарыі : у 4 т. Т.2 / Уклад. С. Калядка і Т. Аўсяннікава ; рэд тома Л. Кісялёва. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 600 с.